# ГУМАНІСТЫЧНЫЯ ІДЭІ Ў ТВОРАХ АЙЧЫННЫХ МЫСЛІЦЕЛЯЎ XVI–XVIII стст. І ІХ УПЛЫЎ НА РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

**Л. Л. Голубева**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, theory-law@bsu.by*

Прааналізаваны гуманістычныя погляды некаторых айчынных мысліцеляў XVI–XVIII стст. Ф. Скарыны, С. Буднага, В. Цяпінскага-Амельяновіча, А. Волана, Л. Сапегі, М. Літвіна, А. Алізароўскага, І. Страйноўскага, І. Храптовіча і інш., паказаны ўплыў іх ідэй на станаўленне і развіццё беларускай дзяржаўнасці.

***Ключавыя словы:*** гуманістычныя ідэі; дзяржава; права; палітыка; заканадаўства; беларуская дзяржаўнасць.

# ГУМАНИСТИЧЕСКИЕ ИДЕИ В ТРУДАХ ОТЕЧЕСТВЕННЫХ МЫСЛИТЕЛЕЙ XVI–XVIII вв. И ИХ ВЛИЯНИЕ НА РАЗВИТИЕ БЕЛОРУССКОЙ ГОСУДАРСТВЕННОСТИ

**Л. Л. Голубева**
*Белорусский государственный университет,*
*пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, theory-law@bsu.by*

Проанализированы гуманистические взгляды некоторых отечественных мыслителей XVI–XVIII вв. Ф. Скорины, С. Будного, В. Тяпинского-Омельяновича, А. Волана, Л. Сапеги, М. Литвина, А. Securityализаровского, И. Страйновского, И. Храптовича и др., влияние их идей на формирование и развитие белорусской государственности.

***Ключевые слова*:** гуманистические идеи; государство; право; политика; законодательство; белорусская государственность.

# HUMANISTIC IDEAS IN THE LEARNED WRITINGS OF DOMESTIC THINKERS OF THE XVI-XVIII CENTURES AND THEIR IMPACT ON THE DEVELOPMENT OF BELARUSIAN STATEHOOD

**L. L. Golubeva**
*Belarusian State University,*
*4 Niezaliežnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus, theory-law@bsu.by*

The humanistic views of such domestic enlighteners of the XVI–XVIII centuries as F. Skorina, S. Budny, V. Tyapinsky-Omelyanovich, A. Volan, L. Sapega, M. Litvin, A. Alizarovsky, I. Strainovsky, I. Khreptovich and others are analyzed. The impact of their ideas on the formation and development of the Belarusian statehood is shown.

***Keywords:*** humanistic ideas; the state; law; politics; legislation; belarusian statehood.

Гуманістычная канцэпцыя свету, грамадства, чалавечай асобы выявілася на ўсіх этапах развіцця беларускай дзяржаўнасці. Так, у дахрысціянскі перыяд гэта першабытная, натуральная гармонія чалавека з жыццёвым асяроддзем. Уся разнастайнасць прыроды і сусвет у цэлым уяўляліся па аналогіі з чалавечым жыццём [1, с. 173]. У перыяд сярэднявечча адбывалася засваенне духоўных адкрыццяў хрысціянства, іх сутнасць раскрылася ў спасціжэнні духоўнага прызначэння чалавека, яго свабоды ад «рабства» ў прыроды, а таксама ў вучэнні пра чалавека як завяршэнне зямнога быцця і боскага тварэння. Хрысціянскі гуманізм прадугледжваў прыярытэт духоўнага пачатку над цялесным, матэрыяльным, абумоўленасць сапраўднай чалавечнасці верай у бога і любоўю да бліжняга, абмежаванасць свабоды, што вынікала з веры ў папсаванасць чалавечай натуры першародным грахом і інш. [2, с. 560].

У эпоху Адраджэння ў Вялікім Княстве Літоўскім (далей – ВКЛ) фарміруецца адметны ад традыцыйнага хрысціянска-сярэдневяковага погляд на чалавека, у аснову якога было пакладзена вучэнне пра неабмежаваную свабоду, уяўленне пра самакаштоўнасць зямнога чалавечага жыцця, натуралізм як спосаб інтэрпрэтацыі сутнасці чалавека і прыроднасацыяльнай рэчаіснасці. Кампанентамі духоўнага свету чалавека побач з верай, высокай маральнасцю абвяшчаліся адукацыя, веды, грамадзянскасць [2, с. 560–561]. Пад свабодай разумеліся павага да жыцця і годнасці чалавека, уласнасці, абарона іх сродкамі права і ўлады. Носьбітамі рэнесансавага гуманізму былі кнігавыдаўцы, вучоныя, філосафы, палітычныя дзеячы, адукаваныя магнаты, дзеячы царквы.

Асаблівасць гуманістычнай культуры і грамадскай думкі ў Беларусі эпохі Рэнесанса заключалася ў адсутнасці індывідуалістычных і элітарных канцэпцый чалавека, арыентацыі на гармонію асобы і грамадства, на адзінства веры і пазнання, царкоўнага і свецкага жыцця [1, с. 173–174].

У светапоглядзе рэнесансавых мысліцеляў-гуманістаў Ф. Скарыны (1490–1551), С. Буднага (1530–1593), В. Цяпінскага-Амельяновіча (каля 1540–1603 (?)), А. Волана (1530–1610), Л. Сапегі (1557–1633) і інш. традыцыйна-хрысціянскія ўяўленні сінтэзаваліся з секулярызаванымі, якія мелі рэнесансавы характар. Сцвярджаліся цярпімасць да іншаверства і іншадумства, права чалавека на ўласны, адметны ад пануючага погляд на рэчы, персанальная адказнасць за свае ўчынкі, ідэя індывідуальнага дабра [2, с. 561]. Разам з тым у айчынным гуманізме дамінавала ідэя агульнага дабра. Абмяркоўвалася магчымасць сінтэзу хрысціянскіх і антычных маральна-філасофскіх каштоўнасцей і выпрацоўкі на гэтай падставе агульначалавечых прынцыпаў паводзін, духоўнай культуры

(С. Будны). Аспектам рэнесансавага гуманізму ў ВКЛ з’яўляліся антыпрыгонніцкія погляды і вучэнні пра сацыяльную роўнасць (Якуб з Калінаўкі (?–1583), Павел з Візны, Марцін Чаховіц (1532–1613)). Для рэнесансавага гуманізму ў ВКЛ характэрна станаўленне нацыянальнай самасвядомасці, усведамленне важнасці развіцця нацыянальнай культуры, роднай мовы, захавання дзяржаўнага суверэнітэту (Ф. Скарына, С. Будны, В. Цяпінскі-Амельяновіч, А. Валовіч (каля 1520–1587 (?)), Л. Сапега, Л. Зізаній (1550–60-я гг.–1634 (?)), М. Сматрыцкі (каля 1578–1633) і інш.).

Пачынальнікам беларускага рэнесансавага асветніцтва быў Ф. Скарына – беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар, выдавец і каментатар першай беларускай Бібліі. Ф. Скарына, грунтуючыся на гуманістычных ідэях прапанаваў сваю сістэму заканадаўства і прававой дзяржавы.

У прадмове да кнігі «Другі закон Маісееў» Ф. Скарына прапанаваў класіфікацыю права. Права, на яго думку, дзеліцца на натуральнае і пісанае. Натуральнае права закладзена ў самой істоце чалавека, яно аднолькавае для ўсіх людзей, уласціва кожнаму чалавеку і не залежыць ад месца і часу. Пісанае права Ф. Скарына падзяляў на боскае, царкоўнае (кананічнае) і земскае. Нормы боскага права змешчаны ў кнігах Старога і Новага Запавету (Бібліі). У гэтай кнізе змешчаны ўсе законы і правы, якімі людзі павінны кіравацца на зямлі. Гэтыя нормы з’яўляюцца сінонімамі волі бога. Таму заслугоўвае асуджэння не толькі той, хто не падпарадкоўваецца волі бога, але і той, хто не ведае яе прадпісанняў. Царкоўнае (кананічнае) права – гэта пастановы (каноны), прынятыя царкоўнай уладай. У земскім праве ў залежнасці ад грамадскіх адносін, што рэгуляваліся пэўнымі нормамі, Ф. Скарына вылучаў: паспалітае права (уключала ў сябе нормы грамадзянскага і сямейнага права), міжнароднае, дзяржаўнае, крымінальнае, ваеннае, гарадское, марское, гандлёвае права.

Выказваючы свае думкі аб заканадаўстве, Ф. Скарына лічыў, што пісаны закон павінен быць годным для выканання, карысным для насельніцтва і адпавядаць звычаям, часу і месцу.

Выказваўся Ф. Скарына і па адным з найбольш важных пытанняў крымінальнага права – аб мэце пакарання. Мэта крымінальнага пакарання – гэта застрашванне злачынцы і адначасова папярэджанне іншым асобам, здольным да злачынства.

Прававыя ідэі Ф. Скарыны паўплывалі на заканадаўства ВКЛ, у прыватнасці на змест помнікаў прававой культуры беларускага народа – статуты ВКЛ 1529, 1566, 1588 гг., якія грунтаваліся на хрысціянскай справядлівасці, правах чалавечай асобы, прынцыпах доказнасці віны,

суровай адказнасці за паклеп, прынцып выключна асабістай адказнасці. Так, на думку прафесара Я. А. Юхо прапанаваная Ф. Скарынам класіфікацыя права была выкарыстана пры падрыхтоўцы першага сістэматызаванага зводу законаў дзяржавы – Статута ВКЛ 1529 г. [3, с. 78–80].

Палітычным ідэалам Ф. Скарыны з'яўлялася асветная, гуманная і моцная манархія. На яго думку манарх павінен быць набожным, мудрым, адукаваным, чулым, справядлівым да сваіх падданых. Ён абавязаны кіраваць дзяржавай у строгай адпаведнасці з законамі, сачыць за справядлівым выкананнем правасуддзя. Адначасова павінен быць моцным і грозным, умець у неабходным выпадку абараніць свой народ. Перавагу Ф. Скарына аддаваў асвечанаму і міралюбіваму гаспадару. Ф. Скарына не адмаўляў у грамадстве маёмаснай няроўнасці, аднак ён лічыў, што ўзаемаадносіны паміж «богатыми» і «убогими» павінны складвацца на аснове «братолюбия». Грамадства павінна грунтавацца на міры і згодзе.

Адным з буйнейшых гуманістаў XVI ст. з'яўляўся М. Літвін. Асветнік у сацыяльна-палітычным трактаце «Аб норавах татар, літоўцаў і масквіцян» (каля 1550 г., выдадзены ў 1615 г.). параўноўваў норавы, звычаі, традыцыі, законы, арганізацыю кіравання і суда ў татарскай, літоўскай і маскоўскай дзяржавах [4, с. 185–263]. Моцную дзяржаўнасць ён звязваў з разумнасцю законаў, з мараллю штодзённага жыцця грамадства, са стабільнасцю сям'і. Адлюстраваў погляды тых, хто кіраваўся ў сваёй дзейнасці нацыянальнымі інтарэсамі ВКЛ.

У трактаце М. Літвін узняў пытанні сацыяльна-палітычнага ўдасканалення грамадства, рэфармавання існуючых грамадскіх інстытутаў. Аснову гарманічнага грамадства бачыў у маёмаснай роўнасці, прытрымліваўся канцэпцыі ідэальнага правіцеля, справядлівага кіравання і правасуддзя. Грамадскія праблемы разглядаў з пазіцый проціпастаўлення дрэнных і добрых звычаяў. Так, імкненням да багацця і раскошы проціпастаўляў самаабмежаванне, памяркоўнасць. М. Літвін закрануў праблему сацыяльнай роўнасці перад законам. На яго думку, павінен быў быць аднолькавы прынцып абкладання падаткамі простага чалавека і шляхціча: чым большая маёмасць, тым большым павінен быць падатак.

Шмат месца ў трактаце адведзена пытанням удасканалення правауддзя. Аноўнае з іх – ахова жыцця простага чалавека. Прынцып «кроў за кроў» павінен быць аднолькавы да ўсіх злачынцаў незалежна ад іх сацыяльнага становішча. Таму М. Літвін лічыў неабходным вызваліць працоўнае насельніцтва з-пад юрысдыкцыі феадалаў, а права на вынясенне смяротнай кары дазволіць толькі вышэйшым судам. Прапаноўваў увесці агульнасаслоўныя суды. У трактаце М. Літвін вылучыў недахопы судовай сістэмы: адсутнасць апеляцыйных судоў, галоснасці, хібы ў сіс-

тэме паказанняў сведак, адсутнасць нормаў судовай пісьменнасці. Аўтар падкрэсліваў, што сістэма непадзельнасці судовай і адміністрацыйнай улад, сумяшчэнне адной асобай некалькіх адміністрацыйных пасад вядуць да страты самой ідэі справядлівасці і незалежнасці суда. Праблемы, узнятыя М. Літвінам у трактаце, часткова былі вырашаны ў час судовай рэформы 1564 г.: удасканалены дзяржаўнае кіраванне і правасуддзе, працэдура судовага разбору, створана апеляцыйная судовая інстанцыя, падрыхтаваны кваліфікаваныя ўраднікі дзяржаўнага кіравання і суда.

Ідэі грамадскай справядлівасці развівалі С. Будны, В. Цяпінскі-Амельяновіч, А. Волан.

Вядомы тэарэтык памяркоўнай плыні арыянства С. Будны ў працы «Пра свецкую ўладу», грунтуючыся на гуманістычных поглядах, выказаў свае адносіны да сучасных яму дзяржавы і дзяржаўных інстытутаў, да воінскага абавязку шляхты, да прыватнай уласнасці, да права ўладання прыгоннымі. С. Будны не быў праціўнікам прыватнай уласнасці. На яго думку, арыянская шляхта можа валодаць маёнткамі, мець прыгонных сялян, таму што прыгонная залежнасць ад шляхты не супярэчыць хрысціянскаму веравучэнню. Ён асуджаў толькі крайнасці феадальнга ладу, найбольш жорсткія праявы прыгонніцтва. У залежнасці ад валодання маёмасцю ён прызнаваў саслоўнае дзяленне сучаснага яму грамадства. Выказваўся за суіснаванне і супрацоўніцтва розных сацыяльных саслоўяў, за роўнасць саслоўяў перад законам.

На думку асветніка дзяржаўная ўлада мае боскае паходжанне і ей неабходна падпарадкоўвацца. Сілай дамагацца ўлады нельга. Таму сапраўдны арыянін можа займаць любыя дзяржаўныя пасады, звяртацца ў суд, весці судовыя працэсы, і нават выконваць абавязкі суддзі. Суддзя павінен быць справядлівым, чэсным, праўдзівым, веруючым; павінен судзіць справядліва, не перакручваць законы, не браць хабару [5, с. 618–620].

Палітычным ідэалам С. Буднага з’яўлялася манархія. Ён вёў разважанні аб асобе ідэальнага манарха. Манарх павінен быць «богабаязненным, справядлівым, міласэрным». Ён павінен акружыць сябе людзьмі разумнымі і вучонымі, якія добра ведаюць законы. Манарх павінен выкарыстоўваць уладу не ў асабістых мэтах, а на карысць усей дзяржавы, дзеля дасягнення магчыма лепшага жыцця.

Васіль Цяпінскі-Амельяновіч выказваў такія ж погляды на дзяржаву і ўласнасць, як і С. Будны. Асветнік развіў сфармуляваную Ф. Скарынам і С. Будным ідэю адзінства і дружбы славянскіх народаў.

Палітычны дзеяч, філосаф і правазнаўца А. Волан у сваіх працах («Пра палітычную або грамадзянскую свабоду», «Прадмова да сената...», «Пра шчаслівае жыцце, або найвышэйшае чалавечае дабро», «Пра гасудара і ўласцівыя яму дабрачыннасці» і інш.) выступаў за рэформы ў сацыяльных і палітычных адносінах, праве і дзяржаўным

кіраванні, распрацоўваў канцэпцыю свабоды чалавека, разглядаў тыя дабрачыннасці, якімі павінен валодаць сапраўдны кіраўнік дзяржавы. Прытрымліваўся тэорыі натуральнага права і выкарыстоўваў для яе характарыстыкі раннехрысціянскі маральны прынцып: «І гэтак ва ўсім, як хочаце, каб з вамі абыходзіліся людзі, так і вы абыходзьцеся з імі» [4, с. 50–182; 6, с. 29–31].

Гуманістычныя погляды дзяржаўнага дзеяча, мысліцеля, заканатворцы, суддзі Л. І. Сапегі (1557–1633) змешчаны ў яго Прадмовах: «Прысвячэнне» выдання Статута каралю польскаму і вялікаму князю літоўскаму – Жыгімонту ІІІ Вазе, «Зварот» да ўсіх саслоўяў (да ўсіх грамадзян) ВКЛ, у лісце Л. Сапегі да біскупа І. Кунцэвіча (1622), у яго самастойнай працы «Выклад трыбунальскіх праў» (1616) [6, с. 91–96; 7, с. 42–48].

Л. Сапега лічыў, што дзяржава паўстала натуральным шляхам і прызначаецца для дасягнення магчыма лепшага жыцця. Яна засноўваецца на прынцыпах унутранага адзінства, цэнтралізма, правапарадку і законнасці. Цэнтральнай катэгорыяй філасофіі права Л. Сапега лічыў катэгорыю свабоды. «Мудрацы ўсіх вякоў лічылі, што ў кожнай дзяржаве прыстойнаму чалавеку нічога не можа быць даражэй за свабоду», – такімі словамі пачынае Л. Сапега «Зварот» да ўсіх саслоўяў ВКЛ. Сутнасць свабоды складаюць неадчужальныя правы чалавека – уласнасці і асабістай недатыкальнасці. Для абароны грамадзянскіх свабод і існуе права, якое Л. Сапега разглядаў як сапраўднае праяўленне розуму чалавека. Права павінна забяспечыць дзяржаве ўнутраны парадак, стабільнае і ўстойлівае развіццё, сацыяльны мір. Жыццё ў адпаведнасці з законамі – абавязковая ўмова існавання дзяржавы. Толькі павага да права дае магчымасць быць сапраўды свабоднымі. Кожны чалавек павінен ведаць межы сваей свабоды, а для гэтага неабходна вывучаць законы. Закон павінен быць аднолькавым і абавязковым для ўсіх саслоўяў. Разам з тым ён павінен быць накіраваны супраць асобных правапарушальнікаў. Калі ў грамадстве адсутнічае павага да права, пануе беззаконнасць, яно не можа лічыцца чалавечым і справядлівым, а з’яўляецца «воўчай зграяй». Права павінна не дапусціць выкарыстання дзяржаўнай улады ў карысных мэтах правіцеля.

Усе гэта дае падставу разглядаць Л. Сапегу як прыхільніка ідэі прававой дзяржавы. Ідэі асветніка наконт дзяржавы, права, заканадаўства былі замацаваны ў артыкулах Статута ВКЛ 1588 г.

Ідэі гуманізму ў XVII ст. развіў правазнавец, палітолаг, сацыёлаг, адзін з прадстаўнікоў свецкага кірунку ў палітыка-прававой думцы Беларусі А. Алізароўскі (1618 (?)–1659). У працы «Аб палітычнай супольнасці людзей» [4, с. 263–279] асветнік стаяў на пазіцыі дваістай ісціны. Гэта выяўлялася пры трактоўцы сутнасці і прызначэння права.

Ён нават не ўспамінаў пра вечнае права, якое паводле вучэння Ф. Аквінскага, лічылася законам вышэйшай боскай мудрасці і крыніцай усіх іншых відаў права. Ён прапанаваў наступную класіфікацыю права: боскае, натуральнае, права народаў. Пры гэтым боскае і натуральнае права знаходзяцца не ў падпарадкаванні другога першаму, а выступаюць як самастойныя віды і дапаўняюць адзін аднаго. А. Алізароўскі пазбягаў спецыяльнага аналізу ролі і прызначэння боскага права, а калі вымушаны быў да яго звяртацца, то даваў яму нетрадыцыйнае тлумачэнне: «Боскае права забараняе несправядлівасць, прыгнечанне бедных і ўсялякія крыўды». Пераважна ён аналізаваў натуральнае права, якое прырода закладвае ў чалавеку як сацыяльнай і біялагічнай істоце. У сацыяльным аспекце прынцыпы натуральнага права выяўляюцца праз развіццё і ўдасканаленне сацыяльнай арганізацыі жыцця людзей: сям'я, фальварак, паселішча, грамадства, дзяржава. З біялагічнай кропкі гледжання правы чалавека вызначаліся яго агульнасцю з жывёльным светам і знаходзілі ўвасабленне ў праве самаабароны, праве распараджэння сабой, імкненні да супрацоўніцтва (зносін) з сабе падобнымі і інш. У сваім вучэнні А. Алізароўскі адводзіць значнае месца, побач з прыродай, розуму і рацыянальным якасцям чалавека. Прырода і розум выступаюць у яго як зыходныя ўзаемадапаўняльныя перадумовы права. Абгрунтаванне натуральна-прававых ідэй дазволіла яму развіваць новае буржуазнае разуменне свабоды і роўнасці.

На думку А. Алізароўскага, існуюць тры віды свабоды: прававая, філасофская, палітычная. Прававая свабода – гэта здольнасць людзей у адпаведнасці з прыроднай і агульнай годнасцю распараджацца сваім жыццём паводле ўласнага разумення і патрабаванняў закону. Філасофская свабода – гэта ўлада розуму над эмоцыямі і імкненнямі. Палітычная свабода – гэта панаванне ў грамадстве права і закону, а не самавольства манарха.

А. Алізароўскі распрацаваў канцэпцыю грамадскага дагавору, паводле якой прызначэнне і мэты дзяржавы звязваюцца з агульнаграмадзянскай карысцю і ўзаемазацікаўленасцю людзей у стварэнні палітычных саюзаў – супольнасцей. Перадумовы гэтага складваюцца ў рэгуляванні адносін у сям'і, двары (сукупнасць некалькіх сем'яў) або панскім фальфарку, паселішчы, дзе ў рознай ступені фарміруюцца інстытуты ўлады бацькоў над дзецьмі, пана над падданымі і інш. Дзяржава, на думку асветніка, – гэта створаны з мноства паселішчаў саюз і аб'яднанне людзей, якія звязаны правам, што і ўвайшлі ў згоду ў імя добрага і шчаслівага жыцця. Праблемы дзяржавы ён цесна звязваў з пытаннямі грамадзянства. Паводле тагачаснай палітычнай ідэалогіі сапраўднымі грамадзянамі была толькі шляхта. На думку А. Алізароўскага грамадзя-

намі дзяржавы з’яўляюцца ўсе жыхары, акрамя рабоў і іншаземцаў. У грамадстве існуюць вышэйшыя і ніжэйшыя саслоўі, але для кожнага павінен існаваць свабодны пераход з аднаго саслоўя ў другое, і грамадзяне ўсіх саслоўяў роўныя перад законам. Ігнараванне прынцыпаў грамадскага дагавору вядзе да гібелі дзяржавы. Разбуральнымі фактарамі з’ўляюцца дзеянні людзей, якія парушаюць чалавечыя сувязі, дрэннае кіраванне, адсутнасць законнасці і справядлівасці, няроўнасць, эгаізм пануючых саслоўяў, несправядлівае выкарыстанне права, асабліва ў судах.

У канцы XVIII ст. пачалі выказвацца ідэі, накіраваныя супраць прыгонніцтва, за пабудову грамадства на аснове хрысціянскай згоды і гармоніі [2, с. 174]. Такіх ідэй прытрымліваліся ідэалагі фізіякратызму, якія ў гэты час карыстаўся асаблівай папулярнасцю.

Фізіякраты сапраўднай крыніцай багацця лічылі зямлю, а сапраўднай прадукцыйнай працай – зямляробскую працу. Таму яны крытыкавалі прыгоннае права, якое стрымлівала прагрэс у сельскай гаспадарцы, выказвалі розныя праекты адмены прыгонніцтва, даказвалі неабходнасць (фермерскага) спосабу вядзення сельскай гаспадаркі. Фізіякраты прытрымліваліся тэорыі натуральнага права і дагаворнага паходжання дзяржавы.

Вядомы ў Беларусі фізіякрат І. Страйноўскі (1752–1815) у творы «Навука аб прыродным і палітычным праве, палітычнай эканоміі і праве народаў» выклаў вучэнне пра натуральны парадак і як вынік яго – натуральнае права [8, с. 416–417]. Натуральны парадак рэчаў ён разглядаў як адзінства фізічнага і маральнага парадку, г. зн. як сукупнасць законаў прыроды і грамадства. Людзі, на яго думку, могуць быць шчаслівыя толькі праз глыбокае пазнанне і поўнае захаванне гэтага натуральнага права; адыход чалавека або грамадства ад дакладных і разумных законаў прыроды выклікае пакаранне – няшчасці, бедствы, беспарадкі і г. д. Натуральныя ж законы выяўляюць толькі натуральныя правы і абавязкі чалавека, да якіх належыць яго імкненне да самазахавання, задавальнення сваіх патрэб у ежы, адзенні, жыллі, прыладах працы. З натуральных правоў і абавязкаў асобнага індывіда ён выдзяляў сацыяльныя правы і абавязкі (вечныя і нязменныя правы асабістай свабоды, узаемнай дапамогі, прыватнай уласнасці). Ён лічыў, што здабытая сумленнай працай прыватная ўласнасць – краевугольны камень грамадства, а яе недатыкальнасць з’яўляецца найпершым натуральным правам чалавека.

Паводле І. Страйноўскага, ніхто не мае права пазбавіць чалавека яго натуральнай свабоды. Ён павінен абараняць ад гвалту сваю ўласнасць і свабоду і, адпаведна, не рабіць замаху на чужую прыватную ўласнасць, не ўжываць сілы ў адносінах да іншых людзей, за выключэннем выпадкаў самаабароны.

Найбольш поўнае ўяўленне пра гуманістычныя ідэі грамадскага, палітычнага і дзяржаўнага дзеяча ВКЛ, прыхільніка фізіякратызму ў Беларусі І. Храптовіча (1729–1812) даюць яго творы «Пра штогодняе аднаўленне краіны» і «Пра натуральнае права» [9, с. 77–79]. Асветнік адзначае аб наяўнасці ў грамадстве «натуральнага парадку», які ўстанаўлівае правы і абавязкі ўсіх членаў грамадства. Для падтрымання такога парадку ў супольным жыцці заключаюцца дагаворы. Чым бліжэй закон да натуральнага права, тым больш ён справядлівы. У цэнтры ўсяго знаходзіцца чалавек з яго патрэбамі, інтарэсамі, правамі і абавязкамі. Паколькі задавальненне патрэб чалавека магчыма толькі ў грамадстве, то кожны павінен лічыцца з патрэбамі іншых членаў грамадства. Але людзі значна адрозніваюцца адзін ад аднаго сваім маёмасным становішчам. Як вынікае з натуральнага парадку рэчаў, кожны павінен працаваць на тым месцы, якое яму натуральна наканавана, не ікнучыся пранікнуць у закрытую для яго сферу. Прагрэсіўным момантам у яго вучэнні з'яўляецца тое, што маральны парадак ён ставіць у залежнасць ад фізічнага парадку прыроды. Маральныя законы, на яго думку, цалкам адпавядаюць таму, што карысна і неабходна чалавеку ў яго жыцці.

І. Храптовіч, як і ўсе фізіякраты, грамадства разглядаў як натуральны арганізм, што складае частку прыроды, у якую ўваходзяць чалавек і яго маральныя прынцыпы. Калі ж чалавек не мае свабоды ці бяспекі або пазбаўлены ўласнасці ён становіцца ізгоем, бескарысным для сябе і грамадства. І. Храптовіч лічыў чалавека і яго здольнасці (перш за ўсе разумовыя) галоўным элементам вытворчасці. Гаспадарчымі рэформамі і вызваленнем сялян ад прыгоннай залежнасці І. Храптовіч абгрунтаваў магчымасць узнаўлення грамадства. Ён верыў, што пры належнай арганізацыі грамадскага жыцця ў адпаведнасці з патрабаваннямі «натуральнага права» ўзнікае магчымасць стварэння пастаянна растучай забяспечанасці і асветы для ўсіх. Гуманізм І. Храптовіча праяўляўся ў павазе да асобы селяніна, прызнанні яго натуральных правоў, ва ўвазе да творчасці народа.

Такім чынам, палітычныя і прававыя ідэі, якія былі выказаны айчыннымі асветнікамі на працягу XVI–XVIII стст. адлюстроўвалі інтарэсы розных сацыяльных класаў і груп беларускага насельніцтва, вызначылі асноўныя напрамкі рэфармавання дзяржавы, грамадства, прававой сістэмы. Іх ідэі наконт палітыкі, права, заканадаўства былі замацаваны ў заканадаўчых актах. Галоўнымі ўмовамі рэфармавання грамадства мысліцелі лічылі ўвядзенне ў дзеянне справядлівых законаў, заснаваных на натуральным праве, а таксама забеспячэнне высокага ўзроўню адукаванасці насельніцтва. Яны абгрунтоўвалі неабходнасць канстытуцыйных форм кіравання, крытыкавалі самадзяржаўе і арыстакратычную алігархію,

выступалі за адмену саслоўных прывілегій, за стварэнне самастойнай і незалежнай дзяржавы, адзначалі неабходнасць захавання і вывучэння гістарычнай спадчыны беларускага народа з мэтай недапушчэння памылак у будучым.

Прагрэсіўныя напрацоўкі, якія былі зроблены айчыннымі асветнікамі з XVI па XVIII ст. аказалі значны ўплыў на далейшае станаўленне і развіццё інстытутаў дзяржавы і права Беларусі, былі выкарыстаны на наступных этапах развіцця беларускай дзяржаўнасці.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Т. 3. Гімназіі-Кадэнцыя / Беларус. Энцыкл. ; рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск: БелЭн, 1996. 527 с.

2. Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя : у 2 т. Т. 1 : Абаленскі-Кадэнцыя / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск : БелЭн, 2005. 688 с.

3. *Юхо Я. А.* Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Мінск : Універсітэцкае, 1992. 270 с.

4. Белорусские мыслители XVI–XVII вв. Избранные труды. Минск : Редакция журнала «Промышленно-торговое право», 2017. 320 с. (Наследие права).

5. Мысліцелі і асветнікі Беларусі. Энцыкл. даведнік. Мінск, 1995. С. 618–620.

6. *Доўнар Т. І., Доўнар Ю. П., Голубева Л. Л.* Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі XVI–XVIII ст. : хрэстаматыя. Мінск : БДУ, 2004. 206 с.

7. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Давед. Камент. / Беларус. Сав. Энцыкл. ; рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск : БелСЭ, 1989. 573 с.

8. Асветнікі зямлі Беларускай : Энцыкл. даведнік / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. Мінск : БелЭн, 2001. 496 с.

9. *Голубева Л. Л.* Іахім Літавор Храптовіч – дзяржаўны, грамадскі дзеяч, фізіякрат, маршалак Галоўнага Суда, міністар замежных спраў, апошні канцлер Вялікага Княства Літоўскага. Юстиция Беларуси. 2015. № 1 (154). С. 77–79.